**Крачкоўскі, А.** Незабыўнае, векапомнае / А. Крачкоўскі // Ленінская трыбуна (Докшыцы). – 1978. – 1 ліп. – С. 2 ; 4 ліп. – С. 3.

## НЕЗАБЫЎНАЕ, ВЕКАПОМНАЕ

Сярод шматлікіх уражанняў, звязаных з воінскай службай, незабыўным застаецца для мяне адзін даволі незвычайны эпізод. У перапынку паміж баявымі вучэннямі я нечакана атрымаў загад прыбыць у штаб палка па выкліку камандзіра часці. Па дарозе вельмі хваляваўся.

Аднак камандзір палка сустрэў мяне лагоднай дабразычлівай усмешкай:

– Таварыш Крачкоўскі, азнаёмцеся, калі ласка, з гэтым вось лістом.

Чытаю: пісьмо ад майго былога настаўніка Анатоля Уладзіміравіча Чарнаруцкага, нязменнага кіраўніка школьнага краязнаўчага гуртка.

А неўзабаве камандаванне часці задаволіла просьбу майго настаўніка адпусціць мяне на некалькі дзён для ўдзелу ў чарговым злёце следапытаў, на які былі запрошаны ўсе ветэраны краязнаўчай работы ў школе.

...Пачаткам гэтай работы і цікавага пошуку паслужыў артыкул, змешчаны ў абласной газеце «Віцебскі рабочы» ў 1984 годзе. Яго аўтар – інвалід Вялікай Айчыннай вайны Пётр Савіч Дуброў. У артыкуле гаварылася аб тым, што 20 жніўня І944 года з малажанскага аэрадрома, які знаходзіўся непадалёку ад станцыі Крулеўшчына Докшыцкага раёна, узняўся авіяцыйны полк і накіраваўся на захад. Курс – Прыбалтыка, станцыя Мажэйкяй. Загад камандавання быў кароткі: разбамбіць вялікую колькасць варожых войск, не даць магчымасці эвакуіраваць жывую сілу і тэхніку. Строй бамбардзіроўшчыкаў узначальваў экіпаж намесніка камандзіра палка маёра Івана Сцяпанавіча Палявога.

...Бомбы трапілі дакладна ў цэль, і самалеты ляглі на зваротны курс. Аднак неўзабаве завязаўся гарачы паветраны бой з нямецкімі знішчальнікамі. Флагманскі самалёт атрымаў пашкоджанне, былі паранены члены экіпажа. Можна было пайсці на вымушаную пасадку, але гэтую думку Палявы ад сябе адагнаў. Перасільваючы боль і слабасць, ён павёў полк на свой аэрадром. Гераічная вытрымка камандзіра надала сілы і астатнім параненым членам экіпажа. Але ў некалькіх кіламетрах ад аэрадрома самалёт страціў кіраванне і вывесці яго са штопару ўжо не было магчымасці...

Так загінулі верныя сыны Радзімы камуністы маёр Іван Сцяпанавіч Палявы, штурман палка маёр Васіль Мікітавіч Ніцай, стралок-радыст сержант Сямён Апанасавіч Шумкоў. Экіпаж быў пахаваны ў вёсцы Малажане Крулеўшчынскага сельсавета. І. С. Палявому было прысвоена пасмяротна высокае званне Героя Савецкага Саюза, маёр В. Н. Ніцай узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Пасмяротна быў узнагароджаны і стралок-радыст С. А. Шумкоў.

Камсамольцы і моладзь Крулеўшчынскай школы з вялікім энтузіязмам, з пачуццём гарачай любві да членаў бессмяротнага экіпажа вырашылі сабраць падрабязныя звесткі аб слаўных сынах Радзімы. У 1964 годзе ў самы разгар збору звестак аб загінуўшых лётчыках у рабят узнікла думка стварыць школьны музей Героя Савецкага Саюза І. С. Палявога. Вучні сустрэліся з жыхарамі вёскі Малажане, распыталі пра месца падзення самалёта, адкапалі там яго абломкі, сабралі шмат іншых экспанатаў – нямых сведак бессмяротнага подзвігу савецкіх сокалаў. Арганізатарам гэтай высакароднай работы былі настаўнік чарчэння і малявання Анатоль Уладзіміравіч Чарнаруцкі. Неўзабаве стварылі краязнаўчы гурток, першымі членамі якога сталі камсамольцы шостых – сёмых класаў Міша Кайкан, Лёня Курсевіч, браты Алег і Вячаслаў Ждановічы, Валерый Рабец, Генадзь Антоненка, Галя Баброўская, Марыя Яцкевіч, Георгій Шабанаў, Таццяна Цюленева і аўтар гэтых радкоў. Пачаў сваю дзейнасць штаб па кіраўніцтву пошукавай работай і правядзеннем паходаў.

Спачатку напісалі ў Міністэрства абароны, у Цэнтральны архіў Узброеных Сіл, Чарнігаўскі аблваенкамат. Адтуль даведаліся, што маёру І. С. Палявому прысвоена пасмяротна званне Героя Савецкага Саюза. І. С. Палявы з першага дня вайны і да моманту сваёй гібелі знаходзіўся на фронце, граміў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, удзельнічаў у абароне Масквы. Баявы шлях Івана Сцяпанавіча, які неўзабаве прасачылі вучні па шматлікіх пісьмах аднапалчан, усхваляваў школу. Аб ім пісалі вучні ў сачыненнях, яго мужнасці і гераізму піянеры прысвячалі свае зборы.

– Я ведаў Івана Сцяпанавіча Палявога з 1940 года, – з глыбокім хваляваннем гаварыў на адкрыцці школьнага музея баявой славы, якое адбылося ў 1965 годзе, ветэран палка і баявы сябар

Пётр Савіч Дуброў. – Ён быў маім першым камандзірам, даваў мне рэкамендацыю ў партыю.

Вайна застала Палявога намеснікам камандзіра экскадрыллі пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў. У першых жа баях Іван Сцяпапавіч заваяваў славу трапнага паветранага стралка, снайпера-бамбардзіра, лепшага лётчыка Паўднёвага фронту. Аб яго баявых подзвігах пісалі франтавыя газеты.

Не менш слаўны баявы шлях прайшоў і штурман палка маёр Васіль Мікітавіч Ніцай. Ён таксама быў мужным і смелым лётчыкам, граміў фашыстаў у Іспаніі, быў цяжка паранены ў паветраным баі пад Мадрыдам.

У ходзе пошукаў краязнаўцы завязалі перапіску з жонкай Ніцая Наталляй Львоўнай і яго дочкамі Верай і Нэляй, запрасілі іх да сябе ў госці. 9 мая 1965 года юныя следапыты сустрэлі сям'ю праслаўленага штурмана. Жонка і дочкі Ніцая расказалі аб жыццёвым шляху Васіля Мікітавіча. Пасля ў пісьме да краязнаўцаў сям'я Ніцая пісала «...Дзесяткі гадоў не ведалі мы, дзе знаходзіцца магіла бацькі і мужа Васіля Мікітавіча Ніцая, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вы, дарагія рабяты, адшукалі адрас наш, паведамілі аб лёсе, апошнім баі і месцы захавання Ніцая...». Адначасова жонка і дочкі Ніцая напісалі допіс у раённую газету «Ленінская трыбуна»: «Шчыра дзякуем рабятам і настаўнікам школы, усім працоўным раёна за тое, што яны, як і мы, свята берагуць памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за нашу Радзіму». Васіль Мікітавіч Ніцай прайшоў вялікі жыццёвы шлях. У дзяцінстве ён быў пастухом, а потым рабочым на будаўніцтве шасэйных дарог і нарэшце стаў лётчыкам. Па закліку гарачага сэрца і сумлення ён адважна змагаўся з ворагам. У жыцці гэта быў сціплы чалавек, вельмі любіў дзяцей. Памяць аб ім ніколі не згасне ў нашых сэрцах...».

Цікавы лёс і ў трэцяга члена экіпажа стралка-радыста Сямёна Апанасавіча Шумкова.

– Пра Сеню Шумкова можна гаварыць бясконца, – пісаў у сваім пісьме да краязнаўцаў былы аднапалчанін і яго баявы сябар Д. М. Кішыцар.

– Ён быў любімцам палка. Цудоўна іграў на баяне, ніколі не сумаваў. Цаніў яго і экіпаж баявой машыны: у шматлікіх баях прыйшлося быць разам і не аднойчы ўменне і вытрымка стралка-радыста выратоўвалі жыццё экіпажа.

У час апошняга вылету быў падбіты самалёт. І пасля таго, як ён упаў на зямлю, параненага і абпаленага выцягнулі Сеню з-пад абломкаў машыны яшчэ жывым. Аб апошніх гадзінах жыцця Шумкова мы ведаем з пісьма Д. М. Кішыцара наступнае: «...Сеня Шумкоў жыў яшчэ суткі. Калі ён прыйшоў у прытомнасць у палявым лазарэце, мне запомніліся яго апошнія словы: «Рабяты, я жывы! Я буду жыць! Я буду яшчэ лятаць!» Але вечарам перастала біцца мужнае сэрца героя...».

У 1968 годзе працоўныя Докшыцкага раёна перанеслі астанкі экіпажа ў раённы цэнтр. На магілу прыязджаюць піянеры, школьнікі, родныя і аднапалчане. Юныя патрыёты школы перапісваюцца з маці мужнага лётчыка Кацярынай Раманаўнай Шумковай.

Усё НОВЫЯ і новыя старонкі бяспрыкладнага подзвігу савецкіх лётчыкаў раскрываюцца перад краязнаўцамі школы па меры атрымання пісем ад ветэранаў 132-га Берлінскага ордэнаў Кутузава і Аляксандра Неўскага палка. Гэта былі не толькі ўспаміны пра асабісты ўдзел у вайне. Гэта праўдзівыя расказы пра вайскавое таварыства, роздум над лёсам загінуўшых і жывых лётчыкаў, іх сем'ях. Шмат пісем, матэрыялаў палка было апублікавана ў газеце «У паход» – органе краязнаўчага гуртка школы.

Створаны ў школе штаб турыстаў-краязнаўцаў працягваў дзейнічаць. Рабяты звязаліся з камандаваннем легендарнага палка. У чэрвені 1965 года адзначалася 25-я гадавіна гэтай часці. На ўрачыстасці былі запрошаны і вучні Крулеўшчынскай сярэдняй школы. Авіятары цёпла сустрэлі юных краязнаўцаў. Актывістам штаба ўручылі мадэль самалёта і Ганаровую грамату камандавання авіяпалка.

Набліжалася 2І-я гадавіна разгрому гітлераўскай Германіі. Ветэраны палка па ініцыятыве былога штурмана Пятра Савіча Дуброва рашылі сустрэцца ў Маскве. На сустрэчу запрасілі юных следапытаў Докшыцкай і Крулеўшчынскай сярэдніх школ. На ўспамін аб гэтай паездцы краязнаўцы прывезлі ў школу серыю цікавых фотаздымкаў. Яшчэ двойчы сустракаліся ў Маскве турысты школы з ветэранамі 132-га авіяпалка.

У выніку пошукаў аднапалчан І. С. Палявога камсамольцы школы пазнаёміліся з былым камандзірам 32-га авіяпалка запасу Аляксандрам Сямёнавічам Хлебнікавым. Ён прыслаў краязнаўцам некалькі хвалюючых пісем з фотаздымкамі, якія расказвалі пра першыя дні

фарміравання палка, кровапралітныя баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на Паўночным, Калінінскім і Заходнім франтах Вялікай Айчыннай вайны. Цэнтральнае месца ў гэтых пісьмах займае франтавы лёс пілотаў, штурманаў, лётчыкаў, тэхнікаў, усіх, хто цаной свайго жыцця набліжаў светлы час вялікай перамогі.

Гарачы ўдзел камсамольцаў і моладзі ў пошукавай рабоце садзейнічаў згуртаванню вучнёўскага калектыву, аб'ядноўваў іх намаганні ў адным высакародным парыве – увекавечыць імёны герояў. Некалькі піянерскіх атрадаў школы носяць імёны В. М. Ніцая, С. А. Шумкова, В. І. Талярэнкі. Камсамольцы школы выступілі з ініцыятывай прысвоіць імя І. С. Палявога адной з вуліц Крулеўшчыны. Цяпер вуліца рабочага пасёлка торфабрыкетнага завода «Віцебскі» носіць імя праслаўленага лётчыка.

Гарачымі і шчырымі былі асабістыя сустрэчы камсамольцаў з ветэранамі вайны. Усяго такіх сустрэч арганізавана звыш сотні. З іх з ветэранамі 132-га авіяпалка – 40.

Сустрэчы вучняў школы з праслаўленымі лётчыкамі А. С. Сіроткіным, Ф. П. Навуменкам, І. І. Кімам, І. Л. Лафазанам, П. С. Дубровым, Э. М. Карымавым, І. П. Плотнікавым, В. М. Платонавым, І. М. Бражнікавым і многімі іншымі назаўсёды застануцца ў памяці камсамольцаў.

Правядзенне паходаў па месцах, звязаных з баявымі дзеяннямі партызанскіх брыгад і атрадаў, вывучэннем гісторыі баявога шляху 132-га Берлінскага ордэнаў Кутузава і Аляксандра Неўскага бамбардзіровачнага авіяпалка, які прымаў удзел у вызваленні Віцебшчыны, у тым ліку Докшыцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, вывучэнне баявога і рэвалюцыйнага мінулага Крулеўшчынскага сельсавета стала традыцыяй у сярэдняй школе. За чатырнаццаць гадоў праведзена больш пяцідзесяці living рознага тыпу паходаў – пешыя, лыжныя, веласіпедныя. Рабяты прайшлі па дарогах роднага краю звыш 10 тысяч кіламетраў, сабралі вялікі краязнаўчы матэрыял. Многія паходы можна назваць унікальнымі па сваёй грамадскай вартасці, па характару сабранага матэрыялу, працягласці маршрутаў, па сіле ўздзеяння акружаючага свету на саміх удзельнікаў паходу. 700 краязнаўцаў пасля выканання нарматываў узнагароджаны значкамі «Юны турыст», «Турыст СССР», 350 рабят сталі ўладальнікамі І, ІІ ІІІ разраду па турызму. Гістарычныя паходы без перабольшання можна назваць школай ваенна-патрыятычнага выхавання.

Больш дваццаці дзён правялі ў веласіпедным паходзе краязнаўцы школы па маршруту Крулеўшчына – Маладзечна – Валошын – Ліда – Гродна – Белавежская пушча – Брэст – Баранавічы – Мінск – Крулеўшчына. У час паходу чырвоныя следапыты сустрэліся з ветэранам 132-га авіяпалка падпалкоўнікам Васілём Сцяпанавічам Грыгор'евым. Аб гэтым чалавеку турысты ведалі яшчэ ў той час, калі па запрашэнню камандавання часці ездзілі на сустрэчу з ветэранамі ў горад Сольцы, што пад Ноўгарадам. Палкоўнік Іван Ільіч Кім расказваў пра Грыгор'ева як аб адным з самых смелых разведчыкаў палка.

Увесь баявы шлях В. С. Грыгор'ева быў непарыўна звязаны з 132-ым авіяпалком, у саставе якога ён не толькі знішчаў ненавіснага ворага, але прымаў удзел у выпрабаванні новай баявой тэхнікі, за што быў узнагароджаны ордэнам Леніна. У час сустрэчы з ветэранам краязнаўцы даведаліся пра цікавыя гісторыі з баявых дзеянняў яго франтавых таварышаў. Цяпер у школьным музеі захоўваюцца дарагія рэліквіі, звязаныя з баявым шляхам В. С. Грыгор'ева. Аднак самымі дарагімі рэліквіямі застаюцца яго пісьмы, адрасаваныя школьнікам «Вы, рабяты, павінны добра разумець, – пісаў ён, — што будучыня нашай Радзімы ў вашых маладых руках. Вось чаму мы, ветэраны, наказваем вам добра вучыцца і любіць сваю Айчыну». Краязнаўчы гурток сумесна з членамі савета музея таксама арганізавалі і правялі шматдзённы велапаход на радзіму В. М. Ніцая ў сяло Дзяснянку Чарнігаўскага раёна. Паход быў прысвечаны 50-годдзю БССР.

Каля 700 кіламетраў прыйшлося пераадолець следапытам, пакуль з хваляваннем не ўступілі на старажытную зямлю Чарнігаўшчыны. Сяло Дзяснянка, якое патанала ў зелені садоў, гасцінна сустрэла пасланцоў Беларусі.

Камсамольцы школы перадалі землякам героя скрынку з зямлёй, узятай на магіле праслаўленага штурмана. Вучаніца мясцовай школы перадала ў дар музею вышыты ручнік, а дочкі Ніцая ўручылі ўдзельнікам паходу скрынку з зямлёй Чарнігаўшчыны.

Чатырнаццаць гадоў кіруе работай краязнаўчага гуртка вопытны педагог Анатоль Уладзіміравіч Чарнаруцкі. За гэты час шмат ужо зроблена па ўшанаванню памяці загінуўшых герояў мінулых баёў. У 1977 годзе Крулеўшчынская сярэдняя школа заняла першае месца ў рэспубліцы па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. За што атрымала матацыкл. У кіраўніка шмат творчых планаў, задум. На змену першым членам гуртка прыйшло новае пакаленне, якое і далей

будзе працягваць пошук аднапалчан 132-га авіяпалка. Радасна, што справа, пачатая намі, знаходзіцца ў надзейных руках, што работай краязнаўцаў кіруе выдатны чалавек і педагог Анатоль Уладзіміравіч Чарнаруцкі. Яго заслугі адзначаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Міністэрства народнай асветы рэспублікі. Я глыбока перакананы ў тым, што выкажу думку ўсіх выхаванцаў, усіх маіх сяброў па краязнаўчай рабоце ў Крулеўшчынскай сярэдняй школе, калі назаву нашага любімага настаўніка, камуніста Анатоля Уладзіміравіча Чарнаруцкага Чалавекам з вялікай літары, які так многа робіць для патрыятычнага выхавання моладзі.

*А. Крачкоўскі, журналіст*